Дзяржаўная ўстанова культуры
“Цэнтралізіваная бібліятэчная сетка Асіповіцкага раёна”
Гарадская бібліятэка № 1




Віртуальнае
прызнанне

vinstar.livemaster.ru



**Францыск Скарына. З прадмовы да «Кнігі Юдзіф»:**

«Як звяры, што блукаюць у пушчы, ад нараджэння ведаюць сховы свае, як птушкі, што лётаюць у паветры, помняць гнёзды свае, як рыбы, што плаваюць у моры і ў рэках, чуюць віры свае і як пчолы бароняць вуллі свае – гэтак і людзі да месца, дзе нарадзіліся і ўзгадаваны ў Бозе, вялікую ласку маюць.»



**У прадмове да Статута ВКЛ 1588 г. Леў Сапега з гонарам зазначыў:**

“Не чужой якой-небудзь мовай, але сваей уласнай, правы свае пісаныя маем і на любую крыўду адпор сваімі законамі дадзім.”



**Адам Міцкевіч. Пра беларусаў і іх мову.**

«На беларускай мове… размаўляе каля дзесяці мільёнаў чалавек. Гэта багатая і чыстая гаворка, якая ўзнікла даўно і выдатна распрацавана. У перыяд незалежнасці Літвы вялікія князі карысталіся ёй для сваёй перапіскі. Літоўскі статут напісаны гэтай мовай, з усіх славянскіх моў найменш змененай і самай гарманічнай».



**Уладзіслаў Сыракомля з “Лістоў з Беларусі”**

“...Пекная гэта галіна славянскай мовы – той крывіцкі дыялект – і старая! Бо гэта мова нашага Літоўскага Статута і заканадаўства на працягу двух стагоддзяў – і пашыраная! Бо смела можна сказаць, што на ей размаўлялі тры чвэрці даўняй Літвы, народ, шляхта і паны”.



**Пісьменнік і этнограф П. Шпілеўскі падчас падарожжа на Беларусі:**

Я здавалася… Ўдыхаў у сябе пачутыя у паветры гукі меладычнай, пявучай мовы, у душу маю так і прасіліся адгалоскі слоў, вымаўленных па звычаю беларусаў, нараспеў, працягла…”






**Францішак Багушэвіч. Прадмова да кнігі “Дудка беларуская”:**

Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі! Пазнаюць людзей ці па гаворцы, ці па адзежы, хто якую носе; ото ж гаворка, язык і ёсць адзежа душы.






**Максім Багдановіч. Летапісец.**

Што тут чынілася у даўнія гады,
Што думалі, чаго жадалі мы тады,
За што змагаліся, як баранілі веру,
–Хай зьведаюць усё патомкі праз паперу!






## Цетка. Шануйце роднае слова!

«Мейце сілу і адвагу дзяржацца роднага слова. Мейце смеласць усюды голасна казаць па-свойму. І, гледзячы на вас, асмеляцца і іншыя…»






**Алесь Гарун. Ты, мой брат, каго зваць беларусам!**

Дык шануй, Беларус, сваю мову –
Гэта скарб нам на вечныя годы;
За пашану радзімаму слову
Ушануюць нас брацця-народы!






**Янка Купала. Роднае слова.**

Магутнае слова, ты, роднае слова!
Са мной ты на яве і ў сне;
Душу мне затрэсла пагудкаю новай,
Ты песень навучыла мяне.






**Якуб Колас.**

“Найвялікшым духоўным багаццем народа з'яўляецца мова. У мове адлюстроўвалася гісторыя народа, яго працоўнае жыццё, яго барацьба, яго смутак і радасць, яго прырода, яго любоў і гнеў».



**Максім Танк. Родная мова.**

З легендаў і казак былых пакаленняў,
З калосся цяжкога жытоў і пшаніц,
З сузор'яў і сонечных цёплых праменняў,
З грымучага ззяння бурлівых крыніц.
З птушынага шчэбету, шуму дубровы,
І з гора, і з радасці, і з усяго
Таго, што лягло назаўсёды ў аснову
Святыні народа, бяссмерця яго, –
Ты выткана, дзіўная родная мова.



**Уладзімір Караткевіч. Беларуская песня.**

Там звіняць неўміручыя песні на поўныя грудзі,
Там спрадвеку гучыць мая мова, булатны клінок.
Тая гордая мова, якую й тады не забудзем,
Калі сонца з зямлёю ў апошні заглыбяцца змрок.

Дык што ж лепей за цябе, мова мая, мова наша?! За цябе, даўняя, за цябе, вечна жывая,

за цябе, неўміручая?!

Уладзімір Караткевіч